разобраться в происходящем и при желании донести правдивую информацию до своего читателя. Эта информация была востребована, поскольку советский опыт давал надежду на решение проблем современности.

### Библиографический список


1. Chambarlin W. H. Russia’s Iron Age. Boston: Little, Brown and Company, 1934. 400 p.
2. Duranty W. Red Russia of Today Ruled by Stalinism, Not Communism [Electronc resource] // New York Times. 1931. 14 June. Mode of accsess: https://www. garethjones. org/soviet_articles/duranty_1931_1. htm. – Date of access: 15. 10. 2022.
3. Duranty W. Soviet Censorship Hurts Russia Most [Electronic resource] // New-York Times. 1931. 23 June. – Mode of access: https://www. garethjones. org/soviet_articles/duranty_1931_7. htm. – Date of access: 15. 10. 2022.
4. Lyons E. Assignment in Utopia. New York: Harcourt, Brace and Company, 1937. 658 p.
5. Голубев А. В. «…Взгляд на землю обетованную": из истории советской культурной дипломатии 1920–1930-х годов. М.: ИЦ ИРИ РАН, 2004. 274 с.
6. Запись беседы народного комиссара по иностранным делам СССР М. М. Литвинова с послом США в СССР У. Буллитом о жалобах американских журналистов в СССР // Советско-американские отношения. 1934–1939 / Отв. сост. Б. И. Жиляев. Серия «Россия. XX век. Документы». М.: МФД, 2003. С. 167–168.
7. Письмо заведующего Отделом печати НКИД СССР К. А. Уманского 1-му секретарю полномочного представительства СССР в США А. Ф. Нейману о деятельности американских журналистов в СССР // Советско-американские отношения. 1934–1939 / Отв. сост. Б. И. Жиляев. Серия «Россия. XX век. Документы». М.: МФД, 2003. С. 177–178.
8. Письмо народного комиссара по иностранным делам СССР М. М. Литвинова полномочному представителю СССР в США А. А. Трояновскому по вопросу претензий, займов и кредитов // Советско-американские отношения. 1934–1939 / Отв. сост. Б. И. Жиляев. Серия «Россия. XX век. Документы». М.: МФД, 2003. С. 168–172.


## УСПАМІНЫ АЛЬФРЭДА РОМЕРА (1864–1865) – НЕДАСЛЕДАВАНАЯ КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ


***А. К. Шымак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*helenaszymak@gmail.com*



У артыкуле разглядаецца асоба Альфрэда Ромера – выдатнага мастака XIX ст., разьбяра, медальера, геральдыста, навукоўца, які быў уладальнікам маёнтка Каралінова (сучасны Пастаўскі раён). Успаміны адносяцца да падзей 1864-1865 гг., калі А. Ромер знаходзіўся пад вартай у Дынабургскай крэпасці.



***Ключавыя словы:*** род Ромераў; гісторыя беларускага мастацтва; крыніцазнаўства.

# ВОСПОМИНАНИЯ АЛЬФРЕДА РОМЕРА (1864–1865) – НЕИЗУЧЕННЫЙ ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ

***Е. К. Шимак***

*Белорусский государственный уиверситет,*
*пр. Независимости, 4 . 220030, г. Минск, Беларусь,*
*helenaszymak@gmail.com*

В статье рассматривается личность Альфреда Ромера – незаурядного художника XIX в., резчика, медальера, геральдиста, ученого, владельца имения Королиново (современный Поставский район). Воспоминания относятся к событиям 1864–1865 гг., когда А. Ромер находился под стражей в Динабургской крепости.

***Ключевые слова:*** род Ромеров; история белорусского искусства; источниковедение.

# MEMOIRS OF ALFRED ROMER (1864–1865) – AN UNEXPLORED SOURCE ON THE HISTORY OF BELARUS

***A. Shymak***

*Belarusian State University,*
*Nezavisimosti Ave. 4, 220030, г. Minsk, Belarus,*
*helenaszymak@gmail.com*

The article discusses the personality of Alfred Romer, a fine artist of the 19th century, carver, medalist, heraldist, scientist, participant in the events of 1863, owner of the Korolinovo estate (modern Postavy district). Memoirs refer to 1864-1865, when A. Romer was in custody in the Dinaburg fortress.

***Keywords:*** Romer family; source study; history of Belarusian art.

Альфрэд Ромер – выдатны мастак, разьбяр, медальер, геральдыст, чалавек, які на ўласныя вочы бачыў падзеі неспакойных 60-х гг. XIX ст. Польскія, літоўскія і нямецкія гісторыкі, даючы звесткі пра гэтага дзеяча, адзначаюць, што ён з’яўляецца і польскім, і літоўскім, і беларускім мастаком. І толькі беларуская гістарыяграфія застаўляе па-за ўвагай жыццёвы шлях гэтага чалавека, найбольш плённыя гады творчасці якога былі непасрэдна звязаны з нашай краінай.

Альфрэд Ромер – прадстаўнік адзінаццатага пакалення роду Ромераў. Ромер – старажытны саксонскі род, адна галіна якога ў XIII ст. асела ў Інфлянтах. На мяжы XVI-XVII стагоддзяў Стэфан Ромер (1560–1635) за ўдзел у бітве пад Кірхгольмам атрымаў маёмасць у Курляндыі. У другой палове XVII ст. Ромеры пераехалі на землі ВКЛ, дзе з цягам часу адмовіліся ад пратэстантызму і прынялі каталіцтва. Старэйшы сын Стэфана – Матэуш, займаў пасаду генерала артылерыі (1673), быў ўдзельнікам ваенных паходаў Яна III Сабескага. Сын генерала Матэуша, таксама Матэуш, быў

паслом на варшаўскі сейм 1695 г., пазней стаў троцкім падкаморым. З прадстаўнікоў роду Ромераў XVIII ст. найбольш актыўным і знакамітым быў Стэфан Дамінік Ромер (1721–1793), троцкі падкаморы і пасол на сеймы, дзе прадстаўляў інтарэсы Радзівілаў. Сынам Стэфана Дамініка быў Міхал Юзэф Ромер (1778–1853), маршалак шляхты віленска-літоўскай губерні, вучыўся ў прыватнай школе ў Сакулцы, а пазней – у Вільні, дзе займаўся грамадскай дзейнасцю, і карыстаўся аўтарытэтам [2, р. 66]. Быў прэзідэнтам віленскага галоўнага суду, у 1812 г. – прызначаны Напалеонам прэзідэнтам горада Вільня, 1820–1826 гг. – прадстаўляў інтарэсы Радзівілаў у сувязі з канфіскацыяй маёмасці Дамініка Радзівіла. Быў членам Таварыства шубраўцаў, актыўным удзельнікам масонсккай ложы «Руплівы Ліцвін». У 1826 г. Міхал Юзэф Ромер быў арыштаваны, адбываў турэмнае зняволенне ў Петрапаўлаўскай крэпасці, а ў 1830–1832 гг – быў сасланы ў Варонеж [8].

Эдвард Ян – адзін з шасці дзяцей Міхала нарадзіўся ў 1806 г. Калі ў 1830 г. распачалося паўстанне, увайшоў у склад Галоўнага Камітэту, які павінен быў кіраваць акцыямі на тэраторыі былога Вялікага Княства Літоўскага. Непасрэднага ўдзелу ў баявых дзеяннях не прымаў і таму змог пазбегнуць суровых рэпрэсій. Але ў 1833 г. усё ж такі быў арыштаваны і сасланы на пажыццёвае пасяленне ў Волагду. Але гэтага ўдалося пазбегнуць, і праз год Эдвард вярнуўся ў Вільню. Па запрашэнню Шымона Канарскага ўдзельнічаў у працы Дэмакратычнага таварыства, за што і быў арыштаваны ў 1838 г. і, зноў жа, сасланы ў Волагду [3, р. IV–XIII].

І ў такой сям'і, дзе шанавалася адукацыя і любоў да мастацтва, ў Эдварда Ромера і Анны з роду Бялазораў 1832 г. нарадзіўся сын Альфрэд. У той час, калі яго бацька Эдвард адбываў ссылку ў Расіі, Альфрэд разам з малодшым братам выхоўваўся ў Вільні пад апекай свайго дзеда Міхала і яго жонкі Рахэлі.

Першую адукацыю атрымаў дома, а пазней – у шляхецкім інстытуце ў Вільні. З дзяцінства праяўлях схільнасць да малявання, урокі жывапісу браў у віленскага мастака Кануція Русецкага. Пазней знаходзіўся разам з сям'ёй бацькі ў Волагдзе (Эдвард Ромер пасля смерці жонкі Анны ажаніўся другі раз. У 1857 г. – з адукацыйнымі мэтамі распачаў падарожжа па краінах Еўропы. Наведаў Дрэздан, Парыж, накіраваўся ў Бельгію і Італію. Сустракаўся з Яўхімам Лелявелям, наведваў князя Адама Чартарыйскага і яго атэль Ламбер [6, р. 419–422].

У 1859 г. вярнуўся дадому і заняўся гаспадаркай у спадчынным маёнтку Крэўна Вількамірскага павету. Але хутка звыклае жыццё

скончылася. У 1864 г. А. Ромер быў арыштаваны і змешчаны ў Дынабургскую крэпасць.

Яго ўспаміны з часу, праведзенага пад арыштам, з'яўляюцца вельмі цікавым гістарычным дакументам. Упершыню яны былі надрукаваныя ў 1912 г. у часопісе «Tygodnik ilustrowany» у апрацоўцы польскага гісторыка Генрыха Масціцкага. Гэта публікацыя была падрыхтаваная на аснове рукапіснага дзённіка А. Ромера, які захавала яго дачка Хелена Ромер-Ахенькоўская. На жаль, зараз невядома, як рыхтаваліся да друку матэрыялы, ці быў дзённік цалкам надрукаваны, альбо толькі яго часткі, ці былі нейкія скарачэнні. Але нягледзячы на гэтыя заўвагі, якія яшчэ чакаюць дэтальнага даследавання, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што гэта гістарычная крыніца вартая ўвагі.

Увесь дзённік можна падзяліць на некалькі частак. На пачатку аўтар апісвае неспакойны час 1863 году: «У атмасферы той вясковай цішы было нешта небяспечнае, распаўсюджваліся нейкія недакладныя звесткі, якія пераходзілі з вуснаў у вусны, і было незразумелым, адкуль яны з'явіліся: то чуткі пра перамяшчэнні па ваколіцах вайсковых аддзелаў ці паўстанцаў, то аб арыштах і пакараннях, якія праводзілі ўлады, то аб кантрыбуцыях, якія накладалі на маёнткі» [4, p. 602].

Вельмі часта можна сустрэцца з такім меркаваннем, што Альфрэд Ромер – гэта актыўны (са зброяй у руках) ўдзельнік падзей 1863 г. Але як вынікае з яго асабістых успамінаў, яго ўдзел заключаўся ў тым, што ён у сваім маёнтку апекаваўся параненымі, даваў прытулак тым, хто шукаў адпачынку і ежы. А. Ромер – выдатны вобраз хрысціянскага жыцця. А. Ромер адзначае, што часам ў яго маёнтак прыбывалі царскія войскі, якія патрабавалі забяспечыць іх пастоем і фуражом. Магчымасці ім адмовіць не было. І калі вайскоўцы былі накормленымі і ўжо на добрым падпітку, псавалі іх зброю. І гэты эпізод, напэўна, з'яўляецца самым «цяжкім» злачынствам, якое ўзгадваецца ва ўспамінах.

Дзённік А. Ромера вельмі цікавы і тым, што аўтар апісвае асаблівасці штодзённага шляхецкага жыцця 60-х гг. XIX ст., як падтрымліваліся сувязі паміж суседзямі, якія тэмы абмяркоўваліся падчас сустрэчаў, якім чынам працягвалася звычайнае жыццё, нягледзячы на неспакойны час.

Далей успаміны датычацца абставінаў яго арышту. А. Ромер звяртаў увагу на прадстаўнікоў царскай улады, адзначаючы, часам, дробныя дэталі: асаблівасці мовы, настрой, паводзіны ў нефармальнай абстаноўцы. Вызывае захапленне, што А. Ромер ні разу ў сваім дзённіку не выказаўся абразліва нават да тых людзей, якія несправядліва ставіліся да яго. Аўтар

дзённіка заўсёды спакойна, ураўнаважана імкнецца растлумачыць (у першую чаргу, напэўна, для сябе) асаблівасці паводзінаў прысланых з глыбіні Расіі людзей. З асаблівым спачуваннем А. Ромер апавядае пра беднага хлопца, якога прымушалі даць супраць яго абвінаваўчыя паказанні, такім чынам звяртаючы ўвагу, на бездаказаннасць ўсёй яго справы.

У наступных некалькіх частках дзённіка апісваліся быт, умовы ўтрымання вязняў Дынабурга. Між іншым, А. Ромер амаль 40 дзён правёў у адзіночнай камеры, чакаючы ў любы момант смяротнага пакарання. А. Ромер адзначае, што вязням даводзілася часам сутыкацца і з бюракратызмам, і з карупцыяй турэмнай адміністрацыі.

Гартаючы старонкі ўспамінаў, можна сустрэць шмат прозвішчаў – тых асобаў, з якімі давялося аўтару сустрэцца ў вязніцы. У першую чаргу гэта былі «палітычныя» вязні, непасрэдных удзельнікаў паўстання было няшмат. А.Ромер зазначыў асаблівы настрой, які панаваў сярод арыштаваных. Аўтар дзённіка імкнуўся паказаць, як людзі жадалі пераджыць складаныя жыццёвыя абставіны і не згубіць маральныя арыентыры [4, p. 729].

Па загаду генерал-губернатара М. М. Мураўёва Альфрэд Ромер, нягледзячы на тое, што быў апраўданы судом, павінен быў выехаць на сталае жыццё ў Кастрамскую губерню. Але дзякуючы збегу абставінаў (М. М. Мураўёва змяніў на яго пасадзе К. П. Каўфман) і пры дапамозе родных, А. Ромер у жніўні 1865 г. быў вызвалены, але з умовай канфіскацыі маёнтку.

У хуткім часе пасля вызвалення ізноў выехаў за мяжу, дзе працягнуў свае заняткі на ніве выяўленчага мастацтва. У 1871–1874 гг. навучаўся у Мюнхенскай акадэміі жывапісу, дзе па сённяшні дзень значыцца ў шэрагу выдатных выпускнікоў гэтай навучальнай установы [1]. Гады вандравання не прайшлі безсэнсоўна. А. Ромер вывучаў жывапіс у Германіі, Італіі. У Мюнхене, Парыжы і Кракаве праходзілі яго выставы. У 1874 г. вярнуўся на Радзіму і ў Вішневе Ашмянскага павету ў касцёле Св. Тадэвуша ўзяў шлюб з Вандай Сулістроўскай, якая была трэцяй з чатырох дачок Эдмунда Сулістроўскага і Антаніны Карніцкай. Ванда Сулістроўская была маладзейшая за Альфрэда на 20 год. У якасці пасагу ад бацькоў яна атрымала маёнтак Каралінова ў Свянцянскім павеце (сучасны Пастаўскі раён, Віцебскай вобласці). У наступныя гады Альфрэд цалкам прысвяціў сябе мастацтву і сямейнаму жыццю [4, p. 580].

У тых нешматлікіх працах, прысвечаных жыццю і творчасці Альфрэда Ромера, аднадушна адзначаецца, што гады праведзеныя ў Каралінове, былі найбольш плёнымі ў жыцці мастака. А. Ромер маляваў партрэты, гравюры,

жывапісныя кампазіцыі пра жыццё і быт беларускіх сялян. Удзельнічаў у роспісе і праваслаўных, і каталіцкіх святыняў. Ствараў цудоўныя медалі. А. Ромер быў не толькі мастаком, але і выдатным навукоўцам. Падрыхтаваў даследаванне пра слуцкія паясы, збіраў старажытныя рукапісы і дакументы. Вывучаў гісторыю Віленскай мастацкай школы [5; 7].

А. Ромер меў перадавыя, на той момант, погляды наконт вядзення гаспадаркі. Яго маёнтак Каралінова прыносіў немалы прыбытак. Разам са сваімі сваякамі Янам Карловічам (жанаты на Ірэне Сулістроўскай), Ігнацыем Чаховічам (жанаты з Селінай Сулістроўскай) і Канстантам Скірмунтам, уладальнікам маёнтка Шэметава, Альфрэд Ромер удзельнічаў у стварэнні пазыкова-ашчаднага банку, які добра развіваўся, але пасля смерці К. Скірмунта і ад’езду Я. Карловіча і А. Ромера, прыйшоў у заняпадак [6, p. 431].

У 80-я гг. XIX ст. сям’я Ромера пераязджае ў Кракаў. Гэты ад’езд быў звязаны з жаданнем прысвяціць час дзеля адукацыі дачкі Алены. Тут А. Ромер і далей працуе як мастак і навуковец. Памёр ён у сваім маёнтку Каралінова з-за трагічнай выпадковасці ў 1897 г., ад інфекцыі, якая развілася ад невялікай раны на руцэ. Пахаваны ў радавым магільным склепе ў Тракаі (Літва).

Пасля смерці мастака яго дачка Алена падлічыла, што ім было створана больш за 200 мастацкіх твораў (63 жывапісныя палотны, 81 пастэль, 41 медальён, 9 скульптур, некалькі дзясяткаў малюнкаў, пейзажаў і акварэляў, копіі ікон і партрэтаў). У сучасны момант у Беларусі ёсць дзве ўнікальныя карціны гэтага мастака. Адна ў касцёле Унебаўзяцця Панны Марыі ў Пінску. Яе яшчэ называюць Пінская Мадонна. Другая карціна – «Ісус і дзіця» знаходзіцца ў вёсцы Камаі, недалёка ад маёнтка Ромераў. Лічыцца, што такім быў запавет мастака, каб карціна захоўвалася менавіта ў касцёле.

Альфрэд Ромер – гэта неардынарная асоба, якая павінна па-сапраўднаму ўвайсці ў нацыянальную гісторыю выяўленчага мастацтва Беларусі, а яго дзённікі, успаміны і навуковыя даследаванні – стаць аб’ектам вывучэння беларускіх гісторыкаў.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Akademie der Bildenden Künste München. Matrikelbuch. Alfred von Roemer. – Режим доступа: https://matrikel.adbk.de/matrikel/mb_1841-1884/jahr_1871/matrikel-02712 ( Дата доступа: 19.11.2019).
2. Mościcki H. Pod znakiem orła i pogoni. Lwów : Książnica Polska, 1923. 255 p.

3. Nie ustawajmy więc w ochocie pisania...: z listów i dzienników trzech pokoleń / wybór, opracowanie i wstęp Danuta Kamolowa. Warszawa : Krąg, 1992. 201 p.
4. Römer, A. Wspomnienia z r. 1864–1865 // Tygodnik ilustrowany. 1912. nr. 28, p. 664; nr. 29, p. 602–603; nr.30, p. 626–627; nr. 31, p. 645–646; nr. 32, p. 684; nr. 34, p. 710; nr. 35, p. 770; nr. 38, p. 793.
5. Römer Alfred // Werke im Nationalmuseum Warschau/Muzeum Narodowe w Warszawie auf Muzeum Cyfrowe. - Режим доступа: http://cyfrowe.mnw.art.pl/dmuseion/results?q=R%C3%B6mer%2C+Alfred&action=SimpleSearchAction&mdirids=1&type=-2 (Дата доступа: 19.11.2019).
6. Romer E. Monografia rodu Römerów na Inflantach i Litwie. Vilnius : Kultūros, filosofijos ir meno institutas, 2009. 526 p.
7. Virtuali paroda „Dailininkų Römerių kūryba“. I dalis. Radvilų rūmų muziejaus lankytojams. – Режим доступа: http://old.ldm.lt/RRM/Rom_virtuali.htm (Дата доступа: 19.11.2019).
8. Шымак А. К. Забытыя імёны Беларусі: Альфрэд Ромер // Беларусь у эпоху геапалітычных і сацыяльных зрухаў Новага і Навейшага часу. Да 25-годдзя кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., г. Мінск, 22 лістап. 2019 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (старш.) [і інш.]. Мінск: БДУ, 2019. С. 82–85.

## НАЛОГОВАЯ ПОЛИТИКА СОВЕТСКОГО ГОСУДАРСТВА ПО ОТНОШЕНИЮ К ПРАВОСЛАВНЫМ СВЯЩЕННОСЛУЖИТЕЛЯМ (1917–1931 гг.).

***И. И. Янушевич***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, г. Минск, Беларусь,* yanush@bsu.by

В статье рассматривается вопрос формирования системы сбора налогов со священнослужителей. Установлено, что властями были предприняты попытки уменьшения численности православных клириков за счет применения максимально высокой планки налогообложения. Проанализированы механизмы воздействия налоговых органов на руководящие органы Русской православной церкви (РПЦ). Рассмотрены виды и размеры взымаемых налогов по категориям плательщиков. Определено, что результаты финансового давления на клириков в рассматриваемый период оказались недостаточными. Способность священнослужителей и верующих к самоорганизации и взаимопомощи требовала более интенсивных мер по лишению их любых видов доходов.

***Ключевые слова:*** Русская православная церковь; налоговые платежи; антирелигиозная работа.

## TAX POLICY OF THE SOVIET STATE IN RELATION TO ORTHODOX CLERGY (1917–1931)

***I. I. Yanushevich***

*Belarusian State University, Independence Ave., 4, Minsk, Belarus,* yanush@bsu.by